ён знайшоў тую аптэкарку, што перадавала медыкаменты для партызан праз Ціхона ў атрад. Але вестка сталася запозненай… «— Ах, як жа затрымаўся гэты ліст! / — Ўздыхалі цяжка тры жанчыны. / — Мы б з таткам з чыстага жыць пачалі, / Не сталі б гнуць прад плёткай спіну!» — ліліся слёзы, але ўжо і «…праменьчык гордасці заззяў / У іх вачах, хоць і нясмела, / І скрухі цень святлейшым стаў, / І плямы з мараў адляцелі..» [3, с. 221]. На пачэсным сходзе ў райвыканкаме сям'ю Сарокаў ушанавалі за подзвіг іх бацькі ў час вайны. Прамоўца казаў: «Таварышы! У грозны час вайны / Быў сувязным Ціхон Сарока, / Ён стаў ахвярай злой маны / І не стрываў людскіх папрокаў. / Няма змаганца у жывых, на жаль, / Але лухта з яго сарвана! / Хай будзе ўцехай для сям'і медаль / Вайны народнай партызану!» [3, с. 222]. Так завяршыўся рух жыццёвага кола млынара Ціхона Сарокі, спыніліся ўрэшце жорны лухты.

У фінале паэмы А. Ягадніцкі зноў звяртаецца да матыву млына, але ўжо ў філасофска-эстэтычным плане. Мароз і завея стварылі ў зімовым Наваградку атмасферу хараства, намялі, па яго словах, «Сумёты мліва з дыяментаў: / Відаць, адзін сусек пад Ражаство / Зіма спустошыла дашчэнту...» [3, с. 223]. Паэт хоча, каб і гэтае хараство, і гістарычная памяць не згінулі бясследна, бо, як ён скрушна піша, народ «з мліва, што наўкол блішчыць, / Не ўмее напячы нічога!» [3, с. 223]. Калі ж ён запытаў у маладых, што ведаюць пра млын і жорны, то адказалі: «— Штосьці ля вады, / Мо банк на востраве афшорным...». Паэт разумее, што жыццё мяняецца: «Цяпер млыны — у глыбіні вякоў, / Навокал — іншыя сюжэты, / Няма ідэалогіі акоў, / У моладзі — другія мэты» [3, с. 224]. І ён думае пра тое, як добра б было, каб людзі ўрэшце «дружнай талакой / Загналі ў дол лухту і звягу» [3, с. 224], знішчылі зло і цемру, якія «дабро дратуюць і крадуць святло…» [3, с. 224].

**Заключэнне.** Як паказвае аналіз паэмы ў адзінстве зместу і формы, А. Ягадніцкі стварае настальгічны вобраз млына як амаль зніклай рэаліі беларускай прыроднай, культурнай прасторы і як сімвалічны асяродак духоўнага жыцця асобы. У спакойныя часы локус млына асэнсоўваецца як тэрыторыя спакою і гармоніі, свабоды гаспадарання, а млынар выяўляецца як самадастатковая асоба. У пераломныя часы лексемы «млын», «жорны» дзякуючы свайму метафорыка-сімвалічнаму патэнцыялу не проста называюць жыццёвыя рэаліі, а выступаюць «знакамі бяды» ў лёсе селяніна-гаспадара і ўвасабляюць трагедыю народа [4].

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Акудовіч, В.* Код атсутнасці. Асновы беларускай ментальнасці / В. Акудовіч. — Мінск : Логвінаў, 2007. — 216 с.
2. *Лассан, Э.* Лингвокультурология. Очерк русской концептологии / Э. Лассан. — Vilnius : Vilniaus pedagoginio universiteto leidukla, 2008. — 140 p.
3. *Ягадніцкі, А.* Выбраныя творы / А. Ягадніцкі. — Баранавічы : Выдавец А. Г. Хахол, 2018. — 230 с.
4. *Белая, А. І.* Млын, хутар і малатарня ў святле мастацкай умоўнасці / А. Белая // Абрысы роднага. Нацыянальныя локусы культуры ў беларускай прозе «эпохі рубяжа» : манаграфія / А. І. Белая ; М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Баранав. дзярж. ун-т. — Баранавічы : БарДУ, 2015. — С. 155—173.



УДК 821.163.3:82-31



**Я. У. Кавальчук**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*


## «ПАДВОЙНАЕ БАЧАННЕ» Ў РАМАНЕ ГЕОРГІЯ МАРЧУКА «КВЕТКІ ПРАВІНЦЫІ»

**Уводзіны.** Імя Г. Марчука, пісьменніка, сцэнарыста, рэжысёра, драматурга, шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. «Кветкі правінцыі» — адзін з найбольш значных эпічных твораў пісьменніка. Даследаванні, прысвечаныя гэтаму раману, скіраваны да тэмы «малой» радзімы, спавядальнасці, жанравай паліфанічнасці тэксту, яго аўтабіяграфічнага пачатку, звароту аўтара да традыцыйных, народных каштоўнасцей [1; 2; 4]. У дадзеным артыкуле зроблена спроба асэнсаваць спалучэнне дзіцячага і дарослага поглядаў «я-героя», асаблівасці іх выяўлення ў рамане «Кветкі правінцыі».

**Асноўная частка.** Матыў сіроцтва займае ў рамане асаблівае месца, і гэта зразумела: аўтар быў сіратою таксама. Рана застаўшыся без маці, Адась Доля, герой рамана, пакутліва шукае дарогу ў самастойнае жыццё. Яго вобраз «адлюстроўвае рэтраспектыўнае асэнсаванне аўтарскай біяграфіі, звязанай з жыццём у Давыд-Гарадку, з маладосцю, юнацтвам... Адася, як і самога аўтара, жыццё выпрабоўвала на трываласць з дзяцінства: мамы рана не стала, а выхаванне ўзяла на сябе бабуля» [1, с. 265]. Сіроцтва героя ўскладняецца яго хваробай, змаганнем за ўласнае жыццё.

Праблему сірочага дзяцінства, пошуку сэнсу жыцця Г. Марчук раскрывае з пазіцый «я-героя» дзіцяці і дарослага чалавека. Крытык П. В. Васючэнка вызначае мастацкую форму «падвойнага бачання» ў творах В. Казько («Суд у Слабадзе», «Высакосны год») [2, с. 731]. На нашу думку, спалучэнне дзіцячага і дарослага поглядаў, існаванне «я-героя» ў розных узростах, яго глыбокая самарэфлексія, трагічнасць


© Кавальчук Я. У., 2019





Репозиторий БарГУ

успамінаў пра дзяцінства, багацце зрокавых малюнкаў дазваляюць гаварыць пра эфект так званага «падвойнага бачання» і ў рамане Г. Марчука «Кветкі правінцыі».

Эпізоды дзяцінства Адася Долі падаюцца ў выглядзе яго ўспамінаў, яркасць і пранізлівасць якіх асабліва прыкметная ў параўнанні з «дарослай» свядомасцю героя — чалавека, які мае вопыт жыццёвага сталення. Дзіцячаму погляду ўласцівы аўтабіяграфізм, спавядальнасць, багацце зрокавых малюнкаў, якое назіраецца ва ўспамінах пра родную вёску, хату, неба, рэчку, маці. Зрокавасць успрыняцця свету асабліва выразная ў трагічных эпізодах: «І вось пахаванне, як снег у спякоту. Слёзы. Чамусьці ўсе: суседзі, родзічы, людзі з іншых вуліц, — пераступаючы парог, хрысцяцца і пачынаюць ціха плакаць, яшчэ не ўгледзеўшы нябожчыцы. Поля прынесла белы з кружалямі абрус, зняла палатно з труны, якім была пакрыта да рук на грудзях яе швагерка» [3, с. 14].

Рэаліі жыцця хлопчыка-сіраты паўстаюць у рэтраспекцыі як штосьці балючае, часам малазразумелае. У кампазіцыйным плане погляд героя-дзіцяці прадстаўлены аўтарам у выглядзе «дзённіка-споведзі», «запісаў», якія Адась пачаў весці ў юнацкім узросце і да якіх вярнуўся праз дванаццаць гадоў. Г. Марчук апісвае пяшчотныя адносіны да маці, якія з’явіліся ў падлетка пасля яе смерці. Пісьменнік часта гаворыць пра пачуцці героя, якія ўзнікаюць у розных жыццёвых абставінах: гэта каханне да Валі Цялегінай, сяброўства з Воўкам-пустэльнікам, але найперш — глыбокі боль ад ранняй страты маці.

Трагізм сіроцтва героя ўзмацняецца апісаннем непасрэднай дзіцячай рэакцыі на навіну аб жывым бацьку: «“Дык у меня, аказваецца, бацька ёсць”, — неяк узбуджана, але без узнёслай радасці падумаў я. Безумоўна, пра яго існаванне я ведаў і раней. Мне цётка Олена казала, што, маўляў, недзе жыве за ракою… Калі ж у меня пыталіся, дзе мой бацька, я адказваў жартам (так навучыла маці): “Косіць сабакам сена” ці “Пайшоў у гарох боб шукаць”. І раптам ён, аказваецца, жыве за ракой у маім мястэчку! Які ён? Як выглядае? Што робіць? Хто ён?» [3, с. 16].

Погляд дарослага героя больш аб’ектызаваны і абагульнены. Ліст, атрыманы з Давыд-Гарадка, стаў пачаткам сістэматызацыі трыццацігадовым героем сваіх успамінаў: «Пачаў я запісы, калі мне споўнілася сямнаццаць гадоў, і вось цяпер, калі мне аж трыццаць, вяртаюся да іх зноў. А ўсё чаму? Справа ў тым, што мне нарэшце ўдалося атрымаць адно такое доўгачаканае пісьмо з майго роднага кутка на беразе Гарыні, Давыд-Гарадка» [3, с. 7].

Імкненне Адася, «дарослага» героя, спасцігнуць прычыны самагубства маці і свайго сіроцтва прыводзіць да рэфлексіі ўласных учынкаў у дзяцінстве і юнацтве. Такая асаблівасць кампазіцыі рамана дазваляе чытачу прасачыць духоўную эвалюцыю, этапы сталення асобы, першы з якіх пачаўся з моманту смерці маці [4, с. 102]. Дарослы «я-герой» шчыра расказвае пра сябе: дзеліцца клопатамі і надзеямі, успамінае дзяцінства, разважае над тым, як ён паступова спасцігаў «пісаныя і няпісаныя» законы быцця, нібы «нехта адчыняў нябачныя дзверы» і ўводзіў юнака ў «новы і незвычайны пакой», як праходзіў праз розныя выпрабаванні.

Пераадолеўшы пакуты сіроцтва і хваробы, Адась рэалізаваў сябе ў жыцці: пераехаў у вялікі горад, стварыў уласную сям’ю, стаў пісьменнікам. Пазіцыя героя — дарослага чалавека — жыццесцвярджальная: «Трэба знайсці сілы і смеласць насіць у сабе мінулае, і яно дапаможа не баяцца смерці. Ave vita!» [3, с. 258].

Пісьменнік стварае раман і ў той жа час самарэфлексуе, уводзячы ўласныя абагульненыя ўяўленні пра чалавека і свет, пра блізкіх і знаёмых, разважаючы пра літаратурную дзейнасць і яе прызначэнне, што дае падставы праводзіць пэўныя аналогіі рамана «Кветкі правінцыі» з такой мастацкай з’явай у сусветнай прозе, як «метараман» [4, с. 101].

**Заключэнне.** Г. Марчук па-мастацку дасканала паказвае жыццё галоўнага героя з двух пунктаў гледжання — дзіцячага і дарослага. «Дзіцячы» погляд вызначаецца яркасцю і пранізлівасцю ўспамінаў, аўтабіяграфізмам, спавядальнасцю, багаццем зрокавых малюнкаў, цяжкімі душэўнымі перажываннямі, «дарослы» — канцэптуалізацыяй і абагульненнем разважанняў героя. Разам з тым як маленькі, так і дарослы Адась прэтэндуюць на ўласны голас, кіруюцца жаданнем змяніць вобраз «бяскрыўднага прасцяка», «выхаванца», «вучня» на сталую, самадастатковую асобу, чалавека, які знайшоў сваё месца ў жыцці. Эфект «падвойнага бачання» героя ў рамане «Кветкі правінцыі» паглыбляе праблематыку твора, надае яму канцэптуальны характар.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. *Пучынская, Т. М.* Аўтабіяграфізм у рамане Г. Марчука «Кветкі правінцыі» / Т. М. Пучынская // Специалист XXI века : материалы IV Междунар. науч.-практ. конф., 22 окт. 2015, г. Барановичи, Респ. Беларусь / редкол.: А. В. Никишова (гл. ред.), А. А. Селезнев, А. В. Прадун (отв. ред.) [и др.]. — Барановичи : РИО БарГУ, 2015. — С. 264—266.

2. *Гніламёдаў, У. В.* Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. / У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск : Беларус. навука, 2002. — Т. 4. — С. 731—734.

3. *Марчук, Г.* Кветкі правінцыі: раман, навелы, афарызмы / Г. Марчук. — Мінск : Маст. літ, 2004. — 416 с.

4. *Іконнікава, Л. У.* Мастацкі свет твораў Георгія Марчука: драматургія, проза, казкі : манаграфія / Л. У. Іконнікова — Мінск : Беларус. рэсп. літаратур. фонд, 2013. — 204 с.



Репозиторий БарГУ